ПЛАНАМ ПАРТЫІ — ЭНЕРГІЮ І ПРАЦУ КАМСАМОЛА!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983

17

ЛІСТАПАДА

ЧАЦВЕР

№ 31 (1407)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

ЦІКАВУЮ ПАЕЗДКУ

ажыццявілі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці хімічнага і юрыдычнага факультэтаў. Нядаўна іх сардэчна віталі ў Міжнародным маладзёжным цэнтры «Юнацтва».

Э. АНІСЕНКА,
мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.

ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

спартакіяды «Здароўе» сярод супрацоўнікаў універсітэта. У спаборніцтвах прынялі ўдзел каманды 18 падраздзяленняў. Агульнакамандную перамогу святкавалі супрацоўнікі механіка-матэматычнага факультэта. На другім месцы — факультэт радыёфізікі і электронікі, на трэцім — вылічальны цэнтр.

І. УЛАДЗІМІРАЎ,
наш кар.

НАВУКОВА-ЭКАНАМІЧНАЕ ТАВАРЫСТВА

ствараецца ў БДУ імя У. І. Леніна. Яно заклікана аб'яднаць усіх выкладчыкаў-эканамістаў і студэнтаў, што вывучаюць эканамічныя дысцыпліны (палітэканомію, эканамічную геаграфію і прыкладную матэматыку) з мэтай садзеяння паспяховаму развіццю эканамічнай навукі і прыбліжэнню яе да патрэб гаспадарчай практыкі, удасканалення вучэбнага працэсу.

Г. МАТВЕЕЎ,
член прафкома супрацоўнікаў.

ДЗЕНЬ ДОНАРА

праводзіцца ў інтэрнаце № 7 па вуліцы Кастрычніцкай. Выкладчыкі і студэнты могуць здаваць кроў у наступныя дні лістапада: 21— філфак, юрфак, журфак, 22—біяфак, хімфак, геафак, факультэт радыёфізікі і электронікі, 23—мехмат, гістфак, СКТБ з ВВ, 24—ФПМ, фізфак. Памятайце, ваша кроў патрэбна для выратавання жыцця людзей!

М. БАЁК,
старшыня арганізацыі таварыства «Чырвонага Крыжа» універсітэта.

МЫ ГАЛАСУЕМ ЗА МІР!

Марш міру камсамольцаў універсітэта — састаўная частка кампаніі «Сусветныя дзеянні моладзі супраць ядзернай пагрозы, за мір і раззбраенне».

РАЗАМ З УСЁЙ савецкай моладдзю камсамольцы універсітэта актыўна ўдзельнічаюць у Маршы міру, таму што гэта акцыя дае магчымасць кожнаму ўнесці свой уклад у агульную справу Ленінскага камсамола. Штогод ва універсітэце праводзіцца збор сродкаў у Фонд міру. Больш за 9 тысяч рублёў — такі ўклад нашых студэнтаў. Кожны студэнцкі будаўнічы атрад залічвае ў свой састаў Ганаровага байца, заробак якога цалкам ідзе ў Фонд міру. Толькі ў 1983 годзе студэнцкімі будаўнічымі атрадамі універсітэта за Ганаровага байца пералічана ў Фонд міру 35316 рублёў, а за Дні ўдарнай працы — 68109 рублёў, каля 11 тысяч рублёў пералічана сельскагаспадарчымі атрадамі.

Ва універсітэце сабрана і адпраўлена ў штаб-кватэру НАТО каля 6 тысяч паштовак з подпісамі ў знак пратэсту супраць ваеннай пагрозы. За час акцыі «Я галасую за мір» у мітынгах салідарнасці ўдзельнічала больш за 7 тысяч камсамольцаў. 29 кастрычніка, у дзень нараджэння Ленінскага камсамола, моладзь горада-героя Мінска выйшла на плошчы і вуліцы на антываенны мітынг, прысвечаны адкрыццю вахты міру моладзі Беларусі. Камсамольская арганізацыя універсітэта была ўдастоена права ад імя Маскоўскага раёна горада Мінска падпісаць эстафетную кнігу міру, а ў час мітынгу да голаса розуму далучылі свае галасы больш за 2,5 тысяч студэнтаў універсітэта.

Асабліва вялікае значэнне маюць акцыі, якія праводзяцца з удзелам замежных студэнтаў. Ва універсітэце вучыцца каля 860 замежных грамадзян, і ўсе яны актыўна ўдзельнічаюць у мітынгах салідарнасці, конкурсах палітычнай песні і плаката, інтэрнацыянальных суботніках.

Замежныя сябры — з намі. І гэта ўмацоўвае веру ў правату нашых дзеянняў.

Сёння, як ніколі раней, неабходны наша дружба, сіла і энергія.

Мы — за мір! Не — вайне!

А. ГУЛЕВІЧ,
загадчыца сектара ўліку камітэта камсамола.

● СЛОВА — ДЭЛЕГАТУ

«ПРАПАНОЎВАЮ, ДЗЕЙНІЧАЮ»

Лепшыя з лепшых камсамольцаў выбраны на справаздачна-выбарную канферэнцыю універсітэта.

Алена ЛУШЫНА — студэнтка філалагічнага факультэта, атрымоўвае стыпендыю імя П. Броўкі. З ёй гутарка:

— ПА-ПЕРШАЕ, я ганаруся, што мне аказалі такі вялікі давер, выбраўшы дэлегатам. Адразу адчуваеш сябе неад'емнай часткай камсамольскага калектыву. Разам з тым памятаеш пра свой абавязак перад таварышамі, і гэта патрабуе ад мяне з яшчэ большай сур'ёзнасцю падыходзіць да вучобы і грамадскай работы.

— Якія, на твой погляд, самыя актуальныя пытанні павінны быць закрануты на канферэнцыі?

— Лічу, што павінны быць разгледжаны пытанні камсамольскай дысцыпліны, ідэалагічнай работы студэнтаў, абмеркаваны вынікі грамадска-палітычнай атэстацыі. На мой погляд, мы не можам стаяць у баку ад праблем, якія хвалююць увесь свет. Наша канферэнцыя праходзіць у час абвастрэння міжнародных адносін. Больш за трыццаць гадоў назад напісана песня «Грэнада». Прысвечана яна барацьбе іспанскіх рэспубліканцаў з франкісцкімі войскамі. І вось зноў Грэнада, але на гэты раз маленькі востраў, сыходзіць крывёю. Мы, камсамольцы, павінны усе разам сказаць: «НЕ!» інтэрвенцыі ЗША на Грэнадзе. Мір, шчасце і радасць усім народам!

— І яшчэ адно пытанне. Што б ты хацела пажадаць удзельнікам канферэнцыі?

— Хочацца пажадаць усім дэлегатам вялікіх поспехаў у вучобе, у камсамольскай рабоце, няспыннага творчага пошуку. І яснага, мірнага неба над галавой.

Гутарыла Т. ГРЫДЗЮШКА,
член прэс-цэнтра камітэта камсамола.

САРДЭЧНА ВІТАЕМ ДЭЛЕГАТАЎ XXX КАМСАМОЛЬСКАЙ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ УНІВЕРСІТЭТА!

ПРЫНЦЫП ЖЫЦЦЯ: ЖАДАЦЬ,

АРЫЕНЦІРЫ ПОСПЕХУ

Камсамольская арганізацыя механіка-матэматычнага факультэта з'яўляецца адной з буйнейшых ва універсітэце. Галоўным у сваёй працы яна лічыць вучобу студэнтаў. Мэта вучэбна-выхаваўчай работы — стварэнне ў студэнцкіх групах абстаноўкі зацікаўленасці заняткамі, навукай і выхаванне свядомасці таго, што выдатная і добрая вучоба — важнейшы грамадскі абавязак студэнта-камсамольца.

ВЫНІКІ апошніх гадоў паказалі правільнасць такой пастаноўкі справы. Пастаяннымі сталі пытанні бягучай паспяховасці і вучэбнай дысцыпліны ў павестках камсамольскіх сходаў, пасяджэнняў бюро груп і патокаў. Усё часцей паступаюць ад груп хадайніцтвы перад вучэбна-выхаваўчай камісіяй, дэканатам аб пакаранні нядбайных студэнтаў. Цэнтр работы перамясціўся ў групы, вырасла адказнасць кожнага студэнта за сваю вучобу і вучобу сваіх таварышаў. Палепшылася абсалютная паспяховасць.

Але барацьба за якасць ведаў не можа прывесці да жадаемых рэзультатаў пры адсутнасці комплекснага падыходу да выхаваўчай работы. Таму пытанні ідэйна-палітычнага, маральна-этычнага, ваенна-патрыятычнага, інтэрнацыянальнага і прававога выхавання заўсёды знаходзяцца ў полі зроку камітэта камсамола.

Арганізатарскія навыкі работы з людзьмі (яны неабходны маладому спецыялісту на вытворчасці) студэнты атрымліваюць толькі пры актыўным удзеле ў грамадскай рабоце, выконваючы камсамольскія даручэнні. Лічым вельмі важным прыцягваць да грамадскай работы як мага больш студэнтаў. Галоўнае тут камітэт камсамола бачыць у правільным размеркаванні даручэнняў, а іменна, па зацікаўленасці — кожнаму тая частка работы, якая б максімальна раскрыла яго магчымасці. Для паспяховага выканання даручэнняў неабходны кантроль. Гэта — адна з галоўных умоў поспеху ў арганізацыі камсамольскіх спраў на факультэце.

Чатыры гады запар камсамольская арганізацыя мехмата прызнаецца лепшай ва універсітэце. Мы вельмі ганарымся сваім факультэтам. Але разумеем і адказнасць за нашы справы. У камсамольскага актыву многа яшчэ праблем. Як стварыць калектыў у акадэмічнай групе? Як палепшыць арганізацыю сацыялістычнага спаборніцтва паміж групамі? Якой павінна быць арганізацыя адпачынку студэнтаў? Чаму з кожным годам цяжэй фарміраваць СБА?

Нам патрэбна многа папрацаваць. Неабходна планаваць рэальныя мерапрыемствы ў групах, на патоках, факультэтах. Планаваць так, каб кожны студэнт не толькі ведаў, што яго чакае ў новым годзе, але і разумеў агульны напрамак работы групы. Імкнемся кожнае мерапрыемства праводзіць на высокім узроўні. Шукаем новыя формы камсамольскай работы. Так, зараз ГПА праводзіцца без удзелу атэстацыйных камісій. Добрай традыцыяй з'яўляецца фарміраванне камуністычных СБА. А колькі выдумкі ўкладваюць студэнты ў правядзенне традыцыйных «Дзён мехмата»!

Залог поспехаў камсамольскай работы ў тым, што кожная група факультэта актыўна ўдзельнічае ў камсамольскім жыцці, мы адчуваем падтрымку партыйнага бюро і дэканата.

В. ЖУК,
сакратар камітэта камсамола мехмата.

● СЛОВА — ДЭКАНУ

Прайшоў справаздачна-выбарны сход камсамольцаў хімічнага факультэта. Прынята пастанова, прыведзены ў парадак пратаколы. Але камсамольскае жыццё факультэта па-ранейшаму хвалюе дэкана В. Ф. Цікавага.

«НЕ ЗАСТАВАЦЦА АБЫЯКАВЫМ»

— НА МОЙ ПОГЛЯД,—гаворыць Вадзім Фёдаравіч,—нашай камсамольскай арганізацыі пад сілу вырашаць самыя розныя праблемы. Аб гэтым сведчаць і поспехі ў вучобе, і ўзмацненне дысцыпліны, і іншыя мерапрыемствы, за якія камсамольцы бяруцца з ахвотай. Ёсць у нас такія студэнты, якія могуць зацікавіць, павесці за сабой. Я з задавальненнем магу назваць імёны Г. Бяляк, Г. Хрол, Г. Рагожы, В. Навошы, У. Радзько.

Але многае і хвалюе мяне, не дазваляе заставацца абыякавым. Перш за ўсё, мала праяўляюць камсамольцы актыўнасці не толькі ў чыста камсамольскіх справах (арганізацыя будатрадаў, правядзенне грамадска-палітычнай атэстацыі, удзел у суботніках і інш.), але і ў арганізацыі вучэбнага працэсу. Можа, не заўсёды вядомыя дэканату патрэбы студэнтаў. Але ж мы не ведаем і іх меркаванні наконт таго ці іншага пытання. Напрыклад, увялі на факультэце вялікі перапынак. Дэканат палічыў гэта мэтазгодным, а студэнты не ведаюць, чым заняцца на працягу 25 хвілін. Можа думае хто, што непатрэбная змена, але чамусьці маўчыць.

Мы прывыклі да таго, што справамі арганізацыі быту студэнтаў звычайна займаецца прафсаюзнае бюро. А ці няма тут спраў і для камсамольскай арганізацыі? Што зрабіў камітэт камсамола карыснага ў інтэрнаце?

Перад намі, выкладчыкамі, стаіць задача не толькі навучыць сённяшніх студэнтаў будучай спецыяльнасці, але і выхаваць іх культурнымі людзьмі, фізічна здаровымі. На першым курсе ўвялі лекцыі па псіхалогіі. А што датычыць заняткаў па фізкультуры, то лічу, што за чатыры гадзіны ў тыдзень сілы не набярэшся. Ёсць над чым падумаць нашым камсамольцам.

І яшчэ. На справаздачна-выбарным сходзе мяне запыталі: «Па чым вы мяркуеце аб камсамольскай арганізацыі: па справах ці па паперках, па якіх мы даём справаздачу аб справах?» Пытанне невыпадковае. Вельмі часта ад нас патрабуюць проста паперку (можа, напісанае ў ёй не адпавядае становішчу, але яна абавязкова павінна быць). Камандзір аднаго з будатрадаў не ў час здаў справаздачу, і вось вынік—факультэт далёка адстаў ад лідэраў. Насцярожвае такое канцылярскае вядзенне спраў з боку камсамольскага кіраўніцтва. Куды большая карысць была б ад таго, каб кожны з нас прытрымліваўся закона: менш слоў, больш справы.

Шмат клопатаў у нашай камсамольскай арганізацыі, шмат нявырашаных пытанняў. І паспяхова справіцца з імі можна толькі тады, калі кожны камсамолец павысіць сваю актыўнасць, стане непрымірымым да абыякавасці, прынцыповым і патрабавальным да сябе і таварышаў.

Запісала А. МАТУСЕВІЧ,
член прэс-цэнтра камітэта камсамола.

Сход камсамольскага актыву універсітэта.

XXVI

РАЗМОВА АБ РАЗМОВЕ З

Адной з задач, што стаяць перад камсамольскай арганізацыяй універсітэта, з'яўляецца павышэнне ўзроўню палітычнай культуры і маральнай сталасці студэнтаў, іх ідэалагічнай актыўнасці. Рашэнне гэтай задачы патрабуе ўзмацнення ролі агітацыйных, прапагандысцкіх і арганізатарскіх функцый камсамольскага насценнага друку, шырокага і прадуманага выкарыстання трыбуны універсітэцкай шматтыражнай газеты «Беларускі універсітэт». Дзякуючы масавасці аўдыторыі чытачоў, насценгазеты груп, курсаў, кафедр, факультэтаў становяцца адным з самых эфектыўных сродкаў фарміравання грамадскай думкі, камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі.

НА ЭФЕКТЫЎНАЕ выкарыстанне друкаваных органаў была накіравана работа прэс-цэнтра камітэта камсамола універсітэта. Якія ж асноўныя вынікі нашых намаганняў?

У газеце «Беларускі універсітэт» было надрукавана 16 артыкулаў, падрыхтаваных прэс-цэнтрам. Арганізаваны аглядконкурс насценнага друку, прысвечаны 60-годдзю ўтварэння СССР. Вялася метадычная работа з адказнымі за сектары друку камітэтаў камсамолаў факультэтаў: на нарадах і вучобах актыву разглядаліся пытанні арганізацыі работы рэдкалегій насценных газет, падрыхтоўкі матэрыялаў для публікацыі ў шматтыражцы і ў рэспубліканскім друку.

Самых добрых слоў заслугоўваюць сектары друку механіка-матэматычнага (сакратар камітэта камсамола В. Жук, адказны за сектар друку — А. Бурдак), радыёфізічнага (сакратар камітэта камсамола У. Гафановіч, намеснік сакратара па ідэалагічнай рабоце Д. Буката, адказная за сектар друку М. Семяновіч), фізічнага (адказны за сектар друку С. Аляксандраў) факультэтаў.

Вялікую дапамогу ў арганізацыі работы прэс-цэнтра, у пошуку новых, больш эффектыўных форм работы аказвае нам рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт».

На жаль, камітэты камсамола шэрагу факультэтаў не ўдзяляюць належнай увагі насценнаму друку. У першую чаргу — гэта вынік недаацэнкі той велізарнай сілы, якую мае друкаванае слова на любым узроўні: ад насценгазеты групы да універсітэцкай шматтыражкі. Мы не павінны праходзіць міма часам нізкага ідэйна-палітычнага ўзроўню насценнага друку факультэта журналістыкі, слабага зместу і афармлення газеты геаграфічнага факультэта. Падкрэслю, што практычна ўся — і арганізатарская, і выканаўчая — работа па выпуску газеты на гэтых факультэтах ляжыць на камсамольскіх арганізацыях.

Ствараецца ўражанне, што камітэт камсамола факультэта журналістыкі (былы сакратар камітэта камсамола У. Бялоў) ухіліўся ад кіраўніцтва насценным друкам. Самы час, на мой погляд, падумаць камсамольскім важакам факультэта аб фарміраванні пастаяннай дзеяздольнай рэдкалегіі факультэцкай газеты, аб упарадкаванні дзейнасці шматлікіх рэдкалегій.

На ўзроўні насценгазет груп — ды і то не лепшых — і літаральна па святах выпускаецца газета геаграфічнага факультэта, дзе сектар насценнага друку ў мінулым навучальным годзе ўзначальваў І. Пракаповіч.

ВЕДАЦЬ, УМЕЦЬ, ДЗЕЙНІЧАЦЬ!

СПРАВАЗДАЧЫ Ў ГРУПАХ. ЧАМУ ЯНЫ НАВУЧЫЛІ?

Калектыў трымае экзамен

Камсамольскія мерапрыемствы. Не сакрэт, што іншы раз яны, закліканыя мабілізаваць на актыўнае, творчае жыццё, праходзяць фармальна, як кажуць, для справаздачы. Здаралася такое і ў нас, у 4 групе тады яшчэ першага курса факультэта прыкладной матэматыкі. Гадавы вопыт работы ў адзіным згуртаваным калектыве навучыў нас, як трэба арганізаваць сваё жыццё, каб плённым было яно не толькі на паперы, але і на справе.

ДА СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАГА сходу і грамадска-палітычнай атэстацыі рыхтаваліся старанна. Кожны камсамолец рабіў справаздачу перад групай, якая яго атэстоўвала, а камісія выстаўляла адзнаку. І, зразумела, думка калектыву — гэта самы аб'ектыўны крытэрый.

З абмеркаваннем першай кандыдатуры адразу высветлілася, што размова будзе дзелавой і сур'ёзнай. Абыякавых не было. Гарачыя спрэчкі зайшлі з-за адзнакі работы нашай Люды К. Ціхая дзяўчына, нядрэнна вучыцца, рэгулярна наведвае заняткі і іншыя абавязковыя мерапрыемствы, нават працавала над выпускам насценгазет. Здавалася б, заслугоўвае толькі добрай адзнакі. Але рабяты вырашылі інакш. Чалавек не можа жыць у калектыве і быць адасобленым ад яго, не мець сяброў, нічым не цікавіцца, ні за што не хвалявацца. Зразумела, ёсць ва ўсім гэтым і частка нашай віны — чаму за год сумеснай вучобы мы нічога пра яе не даведаліся: дзе жыве, чым цікавіцца, чаму такая некамунікабельная ў групе?.. Не ўсе экзамены вытрымаў яшчэ наш калектыў, таму і вырашыла група не называць фамілію Люды ў матэрыяле — ёсць яшчэ час выправіць становішча.

Па-рознаму падыходзілі да ацэнкі ўласнай дзейнасці камсамольцы. Алена Кузьміна, калі прапанавалі ацаніць яе грамадскую работу выдатна, сказала, што не заслугоўвае такой высокай адзнакі. Чалавек крытычна аналізуе сваю дзейнасць, не ідзе на кампраміс з сумленнем, а вось што датычыць Наташы Шынкевіч... Хто толькі ні быў вінаваты ў яе дрэннай паспяховасці: і выдатнікі, і бюро групы, і акадэмсектар! Група не адмаўляла, што работа з адстаючымі наладжана далёка не так, як хацелася б. Для выпраўлення памылак на сходзе быў выбраны новы адказны за акадэмсектар, шукаюцца новыя формы работы. Але... Ніхто з таварышаў не адмовіць у дапамозе, наадварот, на перапынках заўсёды ідзе ажыўленае абмеркаванне «белых плям» у новай тэме. Тады Наташа ўбаку, у яе свае справы і клопаты, ды і на занятках з'яўляецца не вельмі часта. Не, вырашылі мы, не толькі ў вучобе патрэбна табе дапамога, перш за ўсё, трэба дапамагчы табе знайсці сваю жыццёвую лінію, правільна ацаніць свае паводзіны...

Адным з самых адказных быў момант выбараў бюро групы. З адзінаццаці кандыдатур выбралі пяць лепшых, новы састаў бюро аднадушна вырашыў, што і ў гэтым годзе камсоргам групы будзе Люда Радзевіч. Спадзяёмся, што працаваць яна будзе так жа сумленна і шчыра.

...А нядаўна мы сабраліся ўсе разам, глядзелі слайды, пілі чай, пелі будатрадаўскія песні (ў гэтым годзе амаль уся група ездзіла ў СБА «Маладосць»). За гутаркай нехта прапанаваў правесці клуб вясёлых і знаходлівых з мехматам, нехта ўспомніў, што збіраўся напісаць замалёўку для насценгазеты. Так складваўся план мерапрыемстваў на будучае. Трэба—зробім! Вырашылі — ажыццявім! Цікава так жыць.

А. КАВАЛЬЧУК,
студэнтка факультэта прыкладной матэматыкі.

НА ЎЗБРАЕННІ — ЛЕНІНСКІ ЗАЛІК

Выступаючы на III з'ездзе РКСМ, Уладзімір Ільіч Ленін прапанаваў камсамольцам задумацца над пытаннем: як «...выхаваць з сябе камуністаў».

ГЭТАЕ пытанне сёння задае сабе наш сучасчік. Ленінскі залік нарадзіўся як імкненне маладога пакалення Краіны Саветаў яшчэ цясней злучыць вывучэнне марксісцка - ленінскай тэорыі з практычным удзелам у рашэнні бягучых задач работы і вучобы, ва ўмацаванні дыскыпліны і арганізаванасці камсамольскіх радоў.

Зместам Ленінскага заліку з'яўляюцца ўсе асноўныя напрамкі дзейнасці кожнага камсамольца і камсамольскай арганізацыі студэнцкай групы ў цэлым. Ва універсітэце Ленінскаму заліку надаецца вялікая ўвага. Камітэт камсамола універсітэта пастаянна працуе над удасканаленнем практыкі арганізацыі і правядзення, над пошукамі новых эфектыўных форм. Гэта неабходная ўмова паспяховай работы па камуністычнаму выхаванню моладзі.

За перыяд са дня работы XXIX справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі універсітэта праведзены шэраг эксперыментаў. Першы заключаецца ў тым, што камітэт камсамола універсітэта паспрабаваў замяніць прамежкавую атэстацыю ўдзельнікаў Ленінскага заліку палітзалікам. Тым больш, што такая форма была ўжо выпрабавана ў камсамольскіх арганізацыях механіка-матэматычнага факультэта і факультэта радыёфізікі і электронікі. Палітзалік — адна з форм палітычнага выхавання і палітвучобы членаў ВЛКСМ і сумеснай дзейнасці камсамольскіх арганізацый і кафедр грамадскіх навук. Ён дазволіў дапоўніць тэарэтычныя курсы грамадскіх навук аналізам канкрэтных падзей, унутранай і знешняй палітыкі КПСС і Савецкага ўрада, Ленінскага камсамола і камсамольскай арганізацый БДУ.

Савет па ГПП універсітэта, камсамольскі актыў адобрылі практыку правядзення палітзаліку, і зараз ён стане састаўной часткай Ленінскага заліку ў камсамольскай арганізацыі БДУ.

Другі эксперымент заключаецца ў сумяшчэнні тэрмінаў правядзення грамадска - палітычнай атэстацыі і справаздачна - выбарных сходаў у камсамольскіх арганізацыях груп. Гэта пазбаўляе камсамольскія арганізацыі ад непатрэбнай заарганізаванасці і фармалізму, бо аналіз дзейнасці кожнага камсамольца ў рэшце-рэшт павінен даць ацэнку работы арганізацыі ў цэлым. Добры рэзананс дало і правядзенне — у нядзелю — сёлетняй грамадска - палітычнай атэстацыі. Мяркуючы па яе выніках, не ўсё атрымалася гладка, але спроба ўдалася. Атэстацыя паказала, што такая форма можа прымяняцца.

Распаўсюджанне атрымала і камсамольская атэстацыя. Сутнасць яе у тым, што ў састаў атэстацыйнай камісіі ўваходзіць толькі камсамольскі актыў, група сама вырашае, атрымае камсамолец залік ці не. Аднак станоўчыя вынікі такой атэстацыі толькі тэм, дзе дастаткова моцная камсамольская арганізацыя ў групе. Толькі тады аб'ектыўна даецца ацэнка дзейнасці камсамольцаў. Камітэтам камсамола факультэтаў неабходна рэальна падыходзіць да падбору груп, дзе будзе дазваляцца камсамольская атэстацыя.

А. НЕЖАВЕЦ,
намеснік сакратара камітэта камсамола.

● СЛОВА — ЛАЎРЭАТУ ПРЭМІІ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА БЕЛАРУСІ

«Камсамол — мой лёс...»

ДЭКАН падрыхтоўчага аддзялення універсітэта лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Алег Георгіевіч Слука належыць да неспакойнага пакалення камсамольцаў 70-х гадоў. Некалькі гадоў ён узначальваў камсамольскую арганізацыю універсітэта. Да яго і звярнулася наш карэспандэнт з просьбай расказаць аб тым, што хвалявала яго равеснікаў, якія праблемы стаялі перад камсамольцамі універсітэта, як яны іх вырашалі:

— Камсамол заўсёды жыў і жыве гарачым жаданнем выконваць вельмі патрэбныя нашаму народу справы, імкненнем дасягаць пастаўленай мэты. Я працаваў сакратаром камітэта камсамола ў 1971—1973 гадах, калі наш універсітэт бурна рос, расла ў колькасных і якасных адносінах яго камсамольская арганізацыя. Яна налічвала больш за адзінаццаць тысяч членаў ВЛКСМ. Хвалявала шмат пытанняў. Жыццё студэнтаў павінна быць цікавым, насычаным, поўным патрэбных і карысных спраў.

Значнае развіццё атрымалі ў тыя гады студэнцкія навуковыя таварыствы, розныя конкурсы і агляды мастацкай самадзейнасці. Тады ж наладжваліся цесныя навуковыя і вытворчыя сувязі з ВНУ Балгарыі, ГДР...

— Алег Георгіевіч, не маглі б Вы некалькі слоў сказаць пра сучасных камсамольцаў?

— Увогуле, камсамольцы такія ж баявыя, актыўныя, як і ў наш час. Калі дакладна арганізаваць і мабілізаваць людзей, то яны здольны на многае.

Турбуе мяне паніжэнне актыўнасці некаторых камсамольцаў. Хаця, такіх адзінкі. Але іх пасіўнасць, безыніцыятыўнасць накладваюць адбітак на ўсю камсамольскую работу. Хацелася б, каб мацнейшай была дружба паміж камсамольцамі, асабліва на першых курсах, у першыя гады вучобы. Тут патрэбны добры важак, які здольны аб'яднаць усіх, павесці за сабою.

— Што б Вы хацелі пажадаць дэлегатам канферэнцыі, і наогул камсамольцам 80-х гадоў?

— Імкнення. Апантанага імкнення да ўвасаблення нашых ідэалаў. Кім бы ні быў камсамолец: інжынерам ці настаўнікам, калгаснікам ці студэнтам — ён заўсёды павінен быць чалавекам нашай эпохі.

Гутарыла М. ЗАГОРСКАЯ,
член прэс-цэнтра камітэта камсамола.

ЧЫТАЧОМ

Практычна на ўсіх факультэтах дрэнна працуюць рэдкалегіі групавых і курсавых газет.

Жадае быць лепшым і распаўсюджванне газеты «Беларускі універсітэт». У мінулым годзе мы аднадушна перадалі распаўсюджванне газеты камітэту камсамола. Пры гэтым меркавалі, што сакратары камітэтаў камсамола факультэтаў, якія да гэтага не раз выказвалі прэтэнзіі ў адрас прафкома ў сувязі з недахопамі ў распаўсюджванні газеты, прыкладуць усе намаганні, каб шматтыражка даходзіла да кожнага камсамольца. Аднак, як гаворыцца: воз і цяпер там. А камітэт камсамола журфака ў мінулыя тыдні вырашыў зусім не абцяжарваць сябе дастаўкай газеты.

Камітэтам камсамола факультэтаў патрэбна ў бліжэйшы час яшчэ раз прадумаць стройную сістэму распаўсюджвання газеты «Беларускі універсітэт» з тым, каб максімальна расшырыць яе аўдыторыю чытачоў у акадэмічных групах, у інтэрнатах. Сказанае ў поўнай меры адносіцца і да камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў і выкладчыкаў.

Зразумела, што там, дзе не наладжана распаўсюджванне газеты «Беларускі універсітэт», узнікаюць цяжкасці з правядзеннем падпіскі на яе. Так, адстае з падпіскай факультэт журналістыкі. Дрэнна арганізавана распаўсюджванне, ды і не завершана падпіска на хімічным факультэце (сакратар камітэта камсамола У .Белянкоў). А станоўчым прыкладам можа служыць арганізацыя распаўсюджвання і правядзенне падпіскі на «Беларускі універсітэт» на факультэце прыкладной матэматыкі (сакратар камітэта камсамола Л. Панчанка).

Аднак, забяспечыць азнаямленне з газетай кожнага студэнта недастаткова. Мы ў адказе за «зваротную сувязь» чытачоў з рэдакцыяй. Калі чытачы не падкажуць газеце тыя праблемы, якія іх хвалююць, пытанні, якія з усёй вастрынёй патрэбна паставіць на газетнай паласе, універсітэцкая шматтыражка не зможа падтрымліваць давер, павагу чытачоў да сябе. Тут патрэбна мэтанакіраваная работа ўсяго універсітэцкага камсамола, іменна ў гэтым я бачу асноўную кропку прыкладання намаганняў сектара друку і прэс-цэнтра камітэта камсамола універсітэта. Формы работы могуць быць самымі рознымі. Скажу аб адной нашай прапанове. У хуткім часе на факультэтах з'явяцца своеасаблівыя «паштовыя скрынкі», і кожны студэнт зможа цераз іх звярнуцца ў камітэт камсамола БДУ, у рэдакцыю газеты з хвалюючым яго пытаннем. Няма чаго граху таіць, не ўсе яшчэ могуць прыйсці ў камітэт камсамола ці ў рэдакцыю газеты, каб расказаць аб тым, што яго хвалюе, знайсці час для падрабязнага пісьма.

Зараз пачынае сваю работу сектар друку камітэта камсамола універсітэта, стварэнне якога было прадугледжана пастановай бюро камітэта камсамола. Аб некаторых задачах, якія ён будзе вырашаць, я ўжо сказаў вышэй, абмяркоўваючы недахопы ў нашай рабоце. Акрамя гэтага, мы намецілі шэраг мер, накіраваных на павышэнне ролі камсамольскага насценнага друку ў ідэйным выхаванні студэнтаў, актывізацыю работы факультэцкіх сектараў. Адну з першаступенных задач мы бачым у правядзенні метадычнай работы з адказнымі за сектары друку, членамі рэдкалегій. Неабходна распаўсюджваць вопыт, назапашаны лепшымі рэдкалегіямі. Усіх, хто ўдзельнічае ў рабоце над насценнай газетай, патрэбна вучыць асноўным прыёмам літаратурнай работы, умелай і беражлівай рабоце са словам, правільнаму афармленню газеты. У гэтым навучальным годзе будуць арганізаваны семінары для членаў рэдкалегій курсавых, паточных, факультэцкіх газет. Будзе працягнута практыка рэгулярнага правядзення нарад адказных за сектары друку. Разам з тым будзе ўстаноўлены прамы кантроль за зместам курсавых і паточных газет, а ў красавіку праведзены іх агляд-конкурс.

Па-ранейшаму адной з асноўных задач сектара друку камітэта камсамола БДУ застаецца прапаганда станоўчага вопыту, які назапашваецца камсамольскімі арганізацыямі факультэтаў. У сваю чаргу, інфармацыя аб найбольш цікавых універсітэцкіх мерапрыемствах павінна аператыўна з'яўляцца ў рэспубліканскім друку.

У рабоце прэс-цэнтра, з якога пачынаўся сённяшні сектар друку, у мінулым годзе таксама было шмат недахопаў. Мы гэта добра ўсведамляем. Некаторыя цяжкасці, якія можна аднесці да «хвароб росту», мы адчуваем і зараз. Аднак, я перакананы, што рашэнне пастаўленых задач пад сілу сённяшняму саставу сектара друку, і мы прыкладзём усе намаганні для рэалізацыі нашых планаў.

Ю. ВАРАТНІЦКІ,
кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.

ВЫБАР ГАЛІНЫ КРЫСЕВІЧ

Гэты год вельмі шчаслівы для камсамолкі, капітана каманды зборнай БССР па баскетболу, студэнткі другога курса факультэта журналістыкі Галіны Крысевіч (Савіцкай). Двухразовая чэмпіёнка Еўропы разам з камандай у фінале VIII летняй Спартакіяды народаў СССР заваявала бронзавыя медалі, стала лепшым бамбардзірам турніра. А нядаўна Галя да сваіх тытулаў дабавіла яшчэ два. У Бразіліі, у жніўні, яна ўпершыню заваявала залаты медаль чэмпіёнкі свету, а ў верасні, у Венгрыі, стала трохразовай чэмпіёнкай Еўропы.

СЁННЯ, калі заваяваны галоўныя ўзнагароды, калі прыйшло прызнанне балельшчыкаў і спецыялістаў, баскетбольны шлях Галіны Крысевіч здаецца натуральным і хуткім. ДЮСШ «Гарызонта», зборная Мінска, зборная рэспублікі, каманда майстроў, зборная Савецкага Саюза. За восем няпоўных гадоў яна паступова прайшлася па ўсіх ступеньках спартыўнай лесвіцы. Але ж не могуць анкетныя даныя, якія фіксуюць лік, месяц і год руху наперад у наступны клас баскетбольнага майстэрства, расказаць пра чалавека.

Здаецца, яе шлях быў вызначаны загадзя. Галя расла ў спартыўнай сям'і, і ўплыў бацькі — вядучага баскетбаліста мінскага РТІ — быў, без сумнення, вялікі. Тут, што называецца, усе ўказальнікі на дарозе жыцця расстаўлены ў адным напрамку.

Але бацька не прыспешваў дачку з выбарам, баяўся, што яна яго жаданне прыме за сваё ўласнае. А сама Галя ўспрыняла гульню без захаплення, са звычайнай цікавасцю. З такой жа цікавасцю яна назірала за футбольным, хакейным ці валейбольным матчам.

І ўсё-такі аднойчы яна прыйшла ў баскетбольную секцыю. Не таму, што канчаткова і сур'ёзна вырашыла: вось мой любімы від спорту. Ды і ці можна ад трэцяклашкі патрабаваць такіх аргументаваных, дарослых разважанняў? Не, яна проста прыйшла ў баскетбольную залу для самазацвярджэння, для таго, каб быць першай.

І тады, і цяпер гэта падбадзёрваючае пачуццё, называемае славалюбствам, ёй уласціва ў поўнай меры. У такіх выпадках журналісты, расказваючы пра спартсмена і адчуваючы балючае месца, далікатна дадаюць: «...Славалюбства ў лепшым сэнсе гэтага слова». Яе славалюбства не заўсёды было аднолькавым. Яно расло, трансфармавалася, змянялася разам з тым, як расла і змянялася сама Галя. Яна пачала з «хачу быць першай», а прыйшла да «хачу, каб першай была каманда майго горада, маёй рэспублікі, маёй краіны». Невялікае дабаўленне па форме, але змест як пераўвасобіўся.

УВОГУЛЕ ж памылкі свае яна прызнае з цяжкасцю. І хоць у слоўныя дуэлі ўступае ахвотна, але не лічыць іх аргументамі ў спрэчцы. Яе задавальняе толькі практычны доказ. А калі ўлічыць, што на кожны выпадак жыцця такіх — воз і маленькія цялежкі. Пагаварыце з ёю — і яна аргументавана паложыць вас на абедзве лапаткі. І здзівіць.

Любімыя ёю ў школе былі тры прадметы: літаратура, матэматыка і замежная мова. Рэдкае спалучэнне. Марыла, сама не ведае чаму, абавязкова пабываць на Кубе і асабліва ў Іспаніі. Пальмы, мора, карыда, самбрэра—экзотыка ў яе характары. З'ездзіла ў Іспанію на міжнародны турнір («Цудоўная прырода, прыгожыя людзі, а балельшчыкі — расказаць немагчыма. Матч — суцэльная какафонія труб, барабанаў, гаму і апладысментаў»), але на карыду не трапіла, аб чым вельмі шкадуе і цяпер.

Аднак мы гаворым аб дні ўчарашнім. А сёння... Сёння прыйшоў (але не прайшоў!) натуральны час сталення. Яна вучылася баскетболу, а баскетбол вучыў яе. Засталіся дзесьці ва ўчарашнім дні максімалізм, нераўнаважнасць і лішняя гарачнасць, і выкрышталізаваліся лепшыя рысы. Тыя, што былі ёй уласцівы заўсёды, — сумленнасць, вернасць клубу, адданасць гульні, працавітасць.

Увогуле Галя Крысевіч пастаянна здзіўляе сюрпрызамі... Вучылася ў школе толькі на «пяць». А ў дзесятым класе палічыла, што быць «круглым» выдатнікам нядобра — выдатнікаў, маўляў, не любяць. Узяла і атрымала атэстат не вельмі бліскучы... Яна лічыць, напрыклад, што «Гарызонт» на чэмпіянаце Еўропы (калі яшчэ гуляў у першай лізе) мог заняць чацвёртае-пятае месца. Ці аб тым, што сама яна ніколі ў гульні па-сапраўднаму не хвалюецца. (Хоць праз дзесяць мінут сама ж заявіла, што калі выходзіць на штрафныя кідкі ў рашаючых матчах, — трасуцца калені). Ці аб тым, што яе 20 з хвосцікам гадоў — далёка не маладосць і крыху не старасць. Так і гаворыць: «Я амаль старая!». Меркаванняў Крысевіч ёсць у запасе свая арыгінальная, часам вельмі спрэчная думка, якую адстойвае яна вельмі самааддана, то можна ўявіць сабе, як цяжка даводзіцца часам яе настаўнікам і сяброўкам.

Бывае, вядома, усякае. І ўдача спартыўная — справа не апошняя. Але зусім не раптам трапіла Галіна Крысевіч у 1975 годзе ў зборную Мінска, а затым і рэспублікі. Не раптам запрошана ў 1977 годзе ў зборную каманду дзяўчат краіны, у якой затым яна двойчы станавілася чэмпіёнкай Еўропы. І, вядома ж, не раптам стала яна членам галоўнай каманды краіны і капітанам «Гарызонта».

Гладка атрымліваецца: што ні год, то ступенька ўверх. Але гэта толькі такі прывабны знешні бок, а ўнутры... Унутры змаганне, няскончанае супрацьборства паміж «я» і «мы», паміж «хацець» і «магчы», паміж «хацець» і «нельга». Галіна Крысевіч (а цяпер ужо Савіцкая) свой выбар зрабіла даўно.

А. БАРЫСЕВІЧ.
Фота А. ДАБРЫЯНА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

17 лістапада 1983 г.

Зак. 1938. АТ 04549

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ